92(В-Л)
К 12

ПАВЕЛ КАВАЛЕЎ

# ГЕРОЙ САВЕЦКАГА САЮЗА

# ВЛАДЗІМІР ЛАБАНОК



ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР
МІНСК 1946

92[В-Л]
К 12

ПАВЕЛ КАВАЛЁЎ

ГЕРОЙ
СОВЕЦКАГА САЮЗА

# ВЛАДЗІМІР ЛАБАНОК

1025/Бр.

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР
МІНСК 1945

92[В-Л]
К 12

ПАВЕЛ КАВАЛЁЎ

1025/Бр.

# ГЕРОЙ СОВЕЦКАГА САЮЗА
# ВЛАДЗІМІР ЛАБАНОК

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР
МІНСК 1945

Инв.
[illegible]54 г.



## I.

У вёсцы Остраў на Міншчыне жылі бацькі Уладзіміра Лабанка. Жылі бедна. Цяжка было пракарміцца на 1,4 гектара зямлі. Як толькі дзеці крыху падраслі, ім прыйшлося ісці ў наймы да кулакоў. Рана пазнаў гэтакі хлеб і Уладзімір Елісеевіч.

Асабліва цяжка жылося пасля смерці бацькі— Елісея Лабанка. Тры сыны сталі дапамагаць мацеры ва ўсім. Уладзіміру даставалася больш за ўсіх; ён і маці наймаліся працаваць падзённа. За дзень цяжкай працы атрымлівалі прыгаршню мукі на кулеш ці некалькі бульбін. Бульбіны звычайна пяклі ў попеле і елі. А былі дні, што і бульбы не было.

У напружанай працы ішлі дзіцячыя гады Уладзіміра Лабанка. Зімою ўсё-ж ён наведваў школу і, прагны да вучобы, паказваў добрую паспяховасць і належную дысцыплінаванасць. У шаснаццаць год здольны юнак ужо скончыў сямігодку і пачаў рыхтавацца да паступлення на вучобу ў сельскагаспадарчы тэхнікум.

Савецкая ўлада адчыніла дзверы да навукі для сотняў, тысяч юнакоў і дзяўчат, падобных Уладзіміру. Толькі жаданне — і вучыцца можна, колькі хочаш і па якой жадаеш спецыяльнасці. Гэтыя багатыя магчымасці раскрывалі перспектыву, ад якой у Лабанка сэрца гарэла радасцю. Прага да вучобы была незвычайная.

І вось, у 1923 годзе, Уладзімір Лабанок, прыродны хлебароб, які любіць і шануе зямлю, паступае ў сельскагаспадарчы тэхнікум, што ў Мар'інай Горцы. Тут перад ім адкрыліся ўсе таямніцы агранамічнай навукі. Прыродная любоў да зямлі абудзіла думку юнака. Ён адчуў, што ісці яму гэтай дарогай усё жыццё, «гутарыць з зямлёй», як ён пра сябе выказваўся, многа і да падрабязнасцей, ведаць сельскую гаспадарку дасканала, па-навуковаму.

Колькі ўзнікала ў думках найпрыгажэйшых малюнкаў! Ураджайныя палі, зялёныя, з высокаю травою, сенажаці, квітнеючыя бела-белыя сады калектыўных гаспадарак, упарадкаваныя вёскі. Дух захаплялі лекцыі аб перспектывах сацыялістычнай сельскай гаспадаркі.

У 1927 годзе Уладзімір Елісеевіч паспяхова закончыў вучобу ў Мар'інагорскім сельскагаспадарчым тэхнікуме. Дасціпны і прагны да ведаў, ён за час вучобы ў тэхнікуме набыў дастаткова ведаў, каб быць аграномам. Толькі

мала яму гэтага, хацелася большага. Было жаданне яшчэ вучыцца, яшчэ большае пазнаваць. Магчымасці для гэтага былі. Краіна нічога не шкадавала для падрыхтоўкі высокаякасных кадраў спецыялістаў.

Лабанок вытрымлівае іспыты і паступае ў Горацкую сельскагаспадарчую акадэмію. Аўтарытэт гэтай навуковай установы быў настолькі вялікі, што паступіць у яе, вучыцца і працаваць там было шчасцем для яго, у недалёкім мінулым простага сялянскага хлопца.

Няма слоў, — нялёгка было тут Лабанку. Высокая патрабавальнасць, шырыня і новы аб'ём дысцыплін, складанасць і глыбіня галін навукі — усё гэта патрабавала напружанай работы. Вось яна і захапіла Уладзіміра, ды так, што ён і не заўважыў, як беглі гады, як удасканальваўся ён сам як чалавек і як грамадскі работнік. Тут у акадэміі ён быў прыняты ў рады комуністычнай партыі большэвікоў.

Рост яго быў надзвычайны. За якія шэсць — сем год, дзякуючы клопатам савецкай улады, якая стварыла такія мажлівасці развіцця, якая акружыла клопатамі нашу моладзь, Уладзімір Лабанок — сын малазямельнага беларускага селяніна — стаў адукаваным, развітым, палітычна пісьменным спецыялістам. Па сканчэнні Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі ў 1931

годзе маладога здольнага спецыяліста партыя накіроўвае на работу ў апарат Народнага Камісарыята земляробства Беларусі. Працаваў тут Лабанок сумленна, аддаваў усе сілы і веды для справы развіцця новай сацыялістычнай сельскай гаспадаркі. Але імкненне пазнаць глыбіню навукі і жаданне вучыцца не пакідалі яго — і вось ён аспірант Мінскага інстытута сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. А ў 1934 годзе працуе пры Упаўнаважаным Народнага Камісарыята Соўгасаў па БССР у якасці агранома па севазваротах. За невялікі адрэзак часу Уладзімір Елісеевіч, адукаваны і практычны работнік, шырока і ўсебакова распрацаваў сістэму правільных севазваротаў у соўгасах Беларусі. Гэтай работай займалася група спецыялістаў пад яго кіраўніцтвам. У 80 процантах соўгасаў рэспублікі ўжо да канца 1934 года былі ўведзены севазвароты з поўным эканамічным абгрунтаваннем іх. Каштоўнасць і своечасовасць гэтай работы хутка прынеслі свае плённыя вынікі.

Зараз Уладзімір Елісеевіч, аглядаючы пройдзены перыяд практычнай дзейнасці, гаворыць: «Так хутка ўсё адбывалася, што і не заўважаў. А многа чаго было цікавага і, тым часам, цяжкага».

Ішоў ён прамой і надзейнай дарогай, праца-

ваў многа і гэта было адметнай яго рысай. Чалавек справы, ён не любіў інертнасць, застой. Прыходзілася энергічна і смела ісці супроць асобных дрэнных з'яў, якія лічыліся нармальнымі.

Шэсць год плённай працы былі ў гэтым сэнсе знамянальнымі. Лабанка пасылаюць вучыць маладых сельскагаспадарчых спецыялістаў. Назначаюць яго спачатку дырэктарам Бельскага, а затым Смальянскага сельскагаспадарчага тэхнікума. Тут праявіліся яго высокія педагагічныя здольнасці, уменне наводзіць узорны парадак. Так было, напрыклад, у Беліцкім тэхнікуме. Прыехаўшы туды, Лабанок застаў там проста агіднае становішча. Усё было запушчана, выхаванне студэнтаў вялося на такім нізкім узроўні, што Лабанка гэта проста здзівіла. І новы дырэктар навёў парадак. Ён ведаў, як падыйсці да справы, і першую ўвагу аддаў дысцыпліне як сярод выкладчыкаў, так і сярод выхаванцаў. А таму і цяжкасці былі лёгка пераможаны і парадак у рабоце стаў зусім іншы. Тэхнікум у першы-ж год павысіў якасць падрыхтоўкі спецыялістаў.

— Лоўка нас узяў тады Уладзімір Елісеевіч, — гаварылі пасля дзесяткі выхаванцаў Лабанка, выказваючы яму гэтым падзяку і павагу.

Патрабавальнасць да сябе і другіх — добрая рыса. За гэта шанавалі Лабанка і ў Смальянскім сельскагаспадарчым тэхнікуме, адкуль адклікалі Уладзіміра Елісеевіча ў пачатку мая 1941 года ў сувязі з абраннем яго першым сакратаром Лепельскага раённага камітэта партыі.

Адказная партыйная работа была новай для таварыша Лабанка. І таму патрэбна было з максімальнай увагай падыходзіць да вырашэння кожнага пытання. Патрэбна была і дапамога, якую Лабанку аказаў своечасова Цэнтральны Камітэт КП(б) Беларусі.

У разгары была веснавая сяўба. Уладзімір Елісеевіч, патрыёт агранаміі, шчыры пабornік правіл высокай агратэхнікі, з галавой акунуўся ў пасяўныя справы. Яго больш за ўсё бачылі на полі, сярод калгаснікаў. Яны раіліся з ім і сакратар райкома, аграном па прафесіі і душы, з павагай выслухоўваў парады старых сялян з багатым практычным вопытам, вучыўся ў іх.

Раён закончыў пасяўную ў раннія, сціслыя тэрміны на высокім агратэхнічным узроўні. Радаснай явою станавіліся мары, якімі жыў Лабанок на лекцыях у тэхнікуме і Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі. Сцяною ўзнімаліся зялёныя ўсходы на калгасных палях. Усё квітнела, імкнулася да жыцця. На вольнай беларус-

кай зямлі, старанна і дбала дагледжанай працавітымі людзьмі, спеў багаты ўраджай.

Чэрвеньскай раніцай люты вораг парушыў мірнае шчаслівае жыццё нашай радзімы. Крывавы немец — злосны вораг і прыгнятальнік усяго свабоднага і светлага — навязаў нам вайну. Да глыбіні душы патрасла гэтая чорная вестка Владзіміра Елісеевіча Лабанка. Як і ўсе совецкія людзі, ён сустрэў вайну ў момант свайго шпаркага творчага росту, небывалага росквіту мілага краю. Нянавісць да ворага клікала яго да помсты за Беларусь — маці любімую і за сябе — сына яе, узрошчанага і ўзгадаванага ў самыя шчаслівыя совецкія годы жыцця.

## II.

... З групай у сем чалавек сакратар райкома партыі прабіраецца ў глыбіню знаёмага лесу. Скончыўся перыяд стваральнай мірнай працы. У раён уварваліся немцы. Іх танкі таптаді і нішчылі пасевы. Іх артылерыя і пяхота вынішчалі ўсё жывое на зямлі. На ўсход адыходзілі цягнікі з эвакуіраваным абсталяваннем, маёмасцю МТС, соўгасаў, калгасаў.

Па заклікy вялікага Сталіна, па рашэнню Цэнтральнага Камітэта Комуністычнай Партыі

большэвікоў Беларусі таварыш Лабанок уходзіць у падполле, каб адтуль прадаўжаць кіраўніцтва ў новых умовах, нястомна клікаць, арганізоўваць народ на барацьбу з нямецкімі акупантамі. Зямлянка ў лесе стала месцам новага жыхарства, цэнтрам партыйнага падполля. Райком партыі, які ўзначальваецца Владзімірам Елісеевічам, стаў той арганізуючай і накіроўваючай сілай, якая ўзнімала, згуртоўвала і вяла народныя масы на рашучую і бязлітасную барацьбу супроць захопнікаў.

Выконваючы важныя і ясныя ўказанні ЦК КП(б)Б, таварыш Лабанок з усёй энергіяй узяўся за работу. Спачатку гэта былі вылазкі ў бліжэйшыя населеныя пункты для сустрэч з комуністамі, што засталіся там для падпольнай работы. Кожны такі паход заканчваўся стварэннем баявых груп з партыйных і беспартыйных совецкіх патрыётаў.

Штодзень мацаваліся сувязі, расла падпольная арганізацыя, знаходзіліся ўсё новыя і новыя формы і метады работы ў складаных умовах варожага тылу. Лабанок адчуваў сябе гаспадаром на сваёй зямлі. Пасля кожнага, нават невялікага, мерапрыемства, старанна і прадумана праведзенага, ён пераконваўся, што з немцамі народ не пойдзе, што совецкія людзі, якія часова апынуліся пад нямецкім ярмом, не здадуцца,

не здрадзяць сваёй радзіме, бо савецкая ўлада, савецкая радзіма ім дарагі і блізкі.

Перыяд станаўлення заканчваўся. Узнікалі новыя, практычныя пытанні, рашэнне якіх адкладваць нельга было. Глеба была падрыхтавана: наладжаны сувязі, праведзена агітацыйная работа, збіраецца зброя, падрыхтаваны людзі, якія маюць арганізатарскія здольнасці і ведаюць важнасць справы.

Ва ўсе куткі раёна з зямлянкі, з ляснога штаба барацьбы, ішлі пасланцы падпольнага райкома партыі. У іх асобе насельніцтва бачыла сапраўдных прадстаўнікоў роднай савецкай улады, любімай партыі бальшэвікоў. Так ствараліся атрады мужных народных мсціўцаў. Так пачынаўся, упэўнена і моцна рос народны партызанскі рух. Душою гэтага руху быў падпольны райком партыі.

Восенню 1941 года немцы павялі шалёную агітацыю аб так званай «зямельнай рэформе». Гэтым яны хацелі распаліць у людзей прагу да ўласнасці, адыграцца на любві беларускіх сялян да зямлі. Абяцаннямі вялікіх зямельных надзелаў гітлераўцы думалі заманіць беларусаў на свой бок, зрабіць іх здраднікамі, прымусіць працаваць на нямецкіх памешчыкаў.

Партыйная падпольная арганізацыя Лепельшчыны раз'ясняла масам, што нямецкая «рэ-

форма» — гэта ярмо на шыю сялян, яна павяла настойлівую прапаганду супроць мерапрыемстваў гітлераўскіх акупацыйных улад. Падпольны райком арганізаваў друкаванне лістовак, у якіх выкрываў палітыку захопнікаў. Гэтыя лістоўкі адкрылі вочы тысячным масам працоўных Лепельскага, Чашніцкага, Ушацкага і іншых суседніх раёнаў. Насельніцтва праз гэтыя лістоўкі бачыла, што яно не пакінута, не забыта партыяй і совецкай уладай, што ёсць іх прадстаўнікі тут, разам з імі, і паўсямесна зрывала нямецкую правакацыйную рэформу.

Падпольны райком, маючы радыёсувязь з «Вялікай зямлёй», сістэматычна друкаваў лістоўкі «Весткі з Совецкай Радзімы». Гэта яшчэ больш давала ўпэўненасці масам, прыдавала ім сілу для мужнай, бязлітаснай барацьбы з акупантамі. Працоўныя верылі ў кожнае слова большэвіцкай праўды, як верыць кожны чалавек у тое, што пасля ночы наступае раніца і сонца пяшчотна саграває зямлю. У варожым тыле совецкія людзі праз мужных большэвікоўпадпольшчыкаў і партызан даведваліся пра гераічнае змаганне Чырвонай Арміі, пра гераічную і самаадданую працу совецкага тыла і цвёрда верылі ў нашу перамогу. Кожны лічыў сваім святым абавязкам дапамагаць чым толькі

можна партызанам, а гэта значыць сваёй роднай Чырвонай Арміі.

Па ўсяму раёну дзейнасці падпольнага райкома партыі і яго сакратара таварыша Лабанка нарастала сіла нянавісці народа да гітлераўскіх захопнікаў, якая з дня на дзень гатова была выліцца ва ўзброенае супраціўленне. Народ, які пры совецкай уладзе жыў свабодна, не маглі скарыць фашысцкія гуны. Народ, які сваімі вачыма бачыў крывавыя справы нямецкіх забойцаў, — гэты народ аб'явіў сваёй праграмай: «Кроў за кроў і смерць за смерць!».

З болем у сэрцы Уладзімір Лабанок рэагаваў на кожнае нямецкае злачынства ў вёсках свайго раёна. Яму вядома было, што ў вёсцы Каменка ад рук гітлераўскіх катаў загінула 25 чалавек, у вёсцы Пунішча — 22 чалавекі, што поўнасцю знішчаны вёскі Стапчэўская, Острава, Царковішча разам з насельніцтвам.

Голас сэрца клікаў да помсты, патрабаваў толькі аднаго — забівай немцаў, гэтым выратуеш жыццё.

Пачалася баявая дзейнасць першых, арганізаваных падпольным райкомам партыі, партызанскіх атрадаў. Па раёну з маланкавай хуткасцю абляцелі весткі аб тым, як партызаны разграмілі некалькі валасных упраў.

За першыя баявыя аперацыі партызанамі

былі разгромлены Несінская, Прудоцкая, Дварэцкая, Палянская, Іванаўская валасныя ўправы, адзін маёнтак, некалькі сепаратарна-малочных пунктаў. У раёне дзейнасці народных мсціўцаў былі сарваны нарыхтоўкі сельскагаспадарчых прадуктаў і немцам сяляне, замест хлеба і сала, паказалі кукіш. Праўда, у асобныя вёскі для правядзення «нарыхтовак» прыязджалі бургомістры з нямецкай аховай. Але іх пераймалі партызаны па дарогах і знішчалі, разганялі, як пацукоў.

Рос аўтарытэт партызан і іх кіраўнікоў. Да Лабанка ішло новае папаўненне народных змагароў. Людзі браліся за зброю, выступалі на актыўнае змаганне з нямецкімі прышэльцамі. Узнікла пытанне аб узбраенні. Трэба было даставаць вінтоўкі, кулямёты, аўтаматы. Падпольны райком партыі даў указанне пярвічным падпольным арганізацыям правесці адпаведную работу, каб сабраць усю зброю, прыхаваную і падрыхтаваную насельніцтвам для перадачы партызанам.

Гэтае мерапрыемства вылілася ў дэманстрацыю савецкага патрыятызма: з'явіліся новыя кулямёты, аўтаматы, вінтоўкі, патроны. Іх прыносілі старыя і юнакі, дзяўчаты і хлопцы, мужчыны і жанчыны. Уручаючы свой падарунак народным мсціўцам, сяляне выказвалі гарачыя

і шчырыя словы любві да радзімы, совецкай улады, комуністычнай партыі, вялікага Сталіна.

Адна 82-гадовая сялянка, прабраўшыся ў лес і спаткаўшы партызан, патрабавала, каб яе правялі да самага вялікага начальніка.

— Мне ёсць што сказаць яму, — настойліва патрабавала яна.

Старую правялі да Лабанка.

— Таварыш начальнік, — пачала яна, — вось тут (яна развязала хустку, у якой былі загорнуты патроны) мой вам падарунак. Сто адзін патрон. Я хацела-б аднаго, каб усе яны трапілі ў немцаў. А яшчэ хачу сказаць вось што. Я, пэўна, хутка паміраць буду, а вы жыць застанецеся. Дык вось, як начальніка, цябе прашу, сынку, скажы Сталіну, як скончыцца вайна, што лепшай улады, як совецкая, на свеце няма і лепшага жыцця, як у нас было, і жадаць не хочацца. А яшчэ скажы, што старая Аксіння немцаў праклінае.

Лабанок падзякаваў старушцы за патроны і абяцаў выканаць усе яе наказы.

Такіх сустрэч было многа. Усе яны гавораць аб непарыўнай, моцнай сувязі, узаемаразуменні насельніцтва і партызан. Ніці гэтай сувязі насельніцтва з партызанамі з'явіліся той асновай, на якой рос і развіваўся партызанскі рух.

Партызаны ўзбройваліся, абучаліся, рыхта-

1025515

валіся да больш сур'ёзных баявых спраў. Зброя, атрыманая з рук народа, натхняла і вяла іх на подзвіг. Слаўныя сыны народа — партызаны сталі бязлітасна знішчаць фашысцкіх забойцаў, і з кожным боем мацнелі маральна і тэхнічна. Толькі адна засада, якой кіраваў Лабанок, каштавала немцам 18 забітых салдат і страты 2 кулямётаў, аўтамата і некалькіх вінтовак, якія пайшлі на ўзбраенне атрада.

Так пачынаўся новы, шырока разгорнуты этап партызанскай барацьбы. Ішоў 1942 год.

## *III.*

Гэта было ў жніўні другога года вайны. Невялікія партызанскія атрады і баявыя групы, па рашэнню падпольнага райкома партыі, былі аб'яднаны агульным кіраўніцтвам. Так была створана партызанская брыгада. Камандзірам яе быў назначаны адзін з былых дырэктараў МТС (цяпер генерал-маёр, Герой Савецкага Саюза) Ф. Ф. Дуброўскі, а камісарам Уладзімір Елісеевіч Лабанок.

У штабе брыгады пачалася распрацоўвацца кожная аперацыя. Калектыўная думкаператваралася ў дзеянне дакладна, па-вайсковаму. Успамінаецца тав. Лабанку першая з такіх аперацый. Некалькі партызанскіх груп па загаду камандавання брыгады толькі на адзін дзень

вышлі на шасейную магістраль і асядлалі яе. Рух на шасе быў ажыўлены: немцы на аўтамашынах падвозілі да лініі фронта боепрыпасы, салдат.

...Шасе ў некалькіх месцах было замініравана. Засады і наглядаючыя—на месцах. Пачынаецца рух. Адзін, другі выбух грыміць па наваколлю. Варожыя аўтамашыны ляцяць у паветра, ірвуцца снарады. На працягу некалькіх гадзін немцы кідаліся то ў адзін, то ў другі бок шасе. Усюды натыкаліся на міны і агонь з засад. Калона аўтатранспарта расстроілася. Дванаццаць аўтамашын не далічыліся немцы ў гэты дзень. 67 гітлераўцаў, загінуўшых ад партызанскіх куль, валяліся на шасе. Многа немцаў у шматкі разарваліся разам з аўтамашынамі і боепрыпасамі на мінах.

— Ну-ж і далі жару фрыцам — доўга будуць памятаць лепельскую дарогу! — гаварылі партызаны.

Гэтак пачыналася сапраўдная народная помста лютаму ворагу-немцу за яго крывавыя бясчынствы. За поўнасцю знішчаную разам з насельніцтвам вёску Кісцелева. За спаленую вёску Слабодка і замучаных у ёй 102 нявінных савецкіх людзей. За гвалтаванне дзяўчат і жонак. За кроў замучаных і расстраляных урачоў Дзянішчанка і Ладзік, настаўнікаў Хельманенка і

сясцёр Садкоўскіх, савецкіх актывістаў Крыцкіх і Шульга.

* * *

У брыгадзе была адменна наладжана разведка, у якой актыўны ўдзел прымала насельніцтва. Стала вядома, што ў мястэчку Кубкічы размешчан нямецкі гарнізон, камендантам якога з'яўляецца стары германскі афіцэр Цымс. Было вядома і тое, што звяруга Цымс здзекуецца над людзьмі і многа п'е. Усё гэта партызаны, як кажуць, наматалі на вус і парашылі дзейнічаць.

Баявую групу па налёту на гарнізон узначаліў Уладзімір Елісеевіч. Было прынята рашэнне: аперацыю правесці «мірна». Партызаны прабраліся ў мястэчка і кожны з іх заняў указанае месца. Лабанок асабіста наведаў каменданта і «далікатна» прапанаваў скласці зброю і збірацца ў «госці» да партызан. Цымс аж вочы вытрашчыў. І хоць ён быў, як заўсёды, п'яны, але намерваўся абараняцца. Толькі не тут было. Яго ахова была абяззброена. Разам з 12 іншымі палоннымі Цымс быў дастаўлен у штаб брыгады.

У лесе без асаблівых затрымак быў наладжан партызанскі суд. Заядлы гітлеравец, садыст і разбойнік, Цымс трымаў адказ за свае злачынствы над беларускім народам. Бязлітасны прыгавор партызан—пакараць смерцю нягодніка — быў неадкладна прыведзены ў выкананне.

Владзімір Елісеевіч Лабанок аб сваіх асабістых баявых партызанскіх справах расказвае падкрэслена коратка, нібы ўсе дні яго дзейнасці ў варожым тыле былі днямі будняй работы мірных часоў.

— Помсціць немцам, — кажа ён, — у кроў увайшло.

Усё, вядома, не адразу робіцца. Ад невялікіх спраў заўсёды шлях-дарога да значных, салідных мерапрыемстваў. Увосень 1942 года брыгада, дзе камісарам быў Лабанок, адчувалася ўжо як сфарміраваны, узмацнеўшы баявы арганізм, узброены кулямётамі і аўтаматамі і, галоўнае, высокім ідэйна-палітычным духам усяго радавога і каманднага састава.

Праведзеная ў верасні аперацыя па разгрому гарнізона ў м. Камень была ўжо ўзорам ваеннага майстэрства і высокага маральнага стану байцоў. Усе наступальныя сілы партызан былі разбіты на тры групы. Кожная з іх мела свой напрамак— сваю задачу. Пад прыкрыццём начное цемры партызаны бясшумна падыйшлі да нямецкіх умацаванняў. Сігнал — і ўсе рынуліся ў імклівую атаку. Дот і дзоты ўзляцелі ў паветра. Адна за другой запылалі ў агні казармы, памяшканне сувязі. Недалёка ад гарнізона пачуліся выбухі— гэта былі ўзарваны масты, каб перарэзаць шлях адступлення гітлераўцаў.

Немцы, як ачумелыя, кідаліся ў паніцы, не паспеўшы нават узяцца за зброю. Напорысты, трапны агонь партызан касіў іх, прыціскаў да зямлі. Як пацукі, разбягаліся гітлераўцы, куды толькі можна было.

Ад гарнізона не засталося і следу. Гэта аперацыя, якою і на гэты раз кіраваў тав. Лабанок, стварыла брыгадзе славу грознага мсціўцы, што бязлітасна распраўляецца з нямецкімі захопнікамі.

Моцна затурбавала немцаў дзейнасць партызан. Яны пасля невялікіх карных атрадаў, якіх заўсёды чакаў лёс пагалоўнага знішчэння, пачалі снаражаць моцна ўзброеныя экспедыцыі з рэгулярных войск і пасылаць іх супроць партызан. Толькі не паспеюць немцы пачаць наступленне на лес, у якім паводле іх даных, павінны быць партызаны, як іх ужо і след прастыў. Атрады ўжо ў новым месцы і адтуль, адкуль іх не чакае вораг, зноў наносяць сакрушальныя ўдары, разбураюць тыл праціўніка.

Восень 1942 года для партызан брыгады Дуброўскага і Лабанка была багатай, ураджайнай. З дня-ў-дзень народныя мсціўцы наносілі імклівыя ўдары, нападалі, як віхор, крышылі і знішчалі варожыя логавы. У кастрычніку ўсімі атрадамі была праведзена вялікая аперацыя па разгрому нямецкага гарнізона ва Ушачах. Нем-

цы былі выкінуты з раённага цэнтра, а партызаны сталі гаспадарамі мястэчка, якое ўвайшло з гэтага часу ў партызанскую зону. У гэтым-жа месяцы майстэрскі была праведзена аперацыя па знішчэнню нямецкага гарнізона ў мястэчку Пышно. Камандаванне брыгады доўга рыхтавала гэту аперацыю. Немцы, відаць, дазналіся і рашылі пераехаць адтуль у Лепель. Гэты момант выкарысталі партызаны. Па дарозе яны арганізавалі засаду і рашучым штурмам, у момант набліжэння гітлераўцаў на 25—40 метраў, перабілі ўсіх аж да каменданта ўключна. Партызанамі былі ўзяты 2 кулямёты, больш 20 аўтаматаў і вінтовак, многа пісталетаў, боепрыпасаў і 5 падвод з харчаваннем.

Пасля гэтых аперацый у раёне на некалькі дзесяткаў кіламетраў ад немцаў не засталося і духу. Партызанская зона стала непраходнай, непрыступнай для гітлераўцаў. Нягоднікі сядзелі толькі ў Лепелі і ў Чашніках. Сядзелі, зубамі ляскалі ды выпрашвалі падмацаванні ў свайго вышэйшага камандавання.

Тым часам партызаны абрушыліся на чыгуначныя камунікацыі. Ачышчэнне ад немцаў дзесяткаў населеных пунктаў у раёне дзейнасці партызан, дало магчымасць смела манеўраваць і абрушваць агонь на эшалоны праціўніка адначасова ў некалькіх месцах. Кожны дзень

ляцелі пад адкос нямецкія паязды з тэхнікай і жывой сілай. Як ваўкі, вылі немцы, кусалі сябе за пальцы чыгуначныя каменданты, а прадухіліць узрывы эшалонаў не маглі. Уночы зусім спыняўся рух на вялікім участку чыгункі.

Ёсць адна характэрная дэталь у барацьбе партызан брыгады Дуброўскага і Лабанка. Гэта дэталь вельмі важная з пункту гледжання нават гістарычнага. Яны не толькі пускалі пад адкос, але многія эшалоны разбівалі да канца. Так, восенню і зімой 1942 года было поўнасцю знішчана 11 вялікіх саставаў, што ішлі да лініі фронта.

У снежні, напрыклад, трыма атрадамі брыгады была арганізавана засада ля станцыі Зябкі. На досвітку партызаны выставілі на ўзгорку 45-міліметравую гармату і чакалі прыходу патрэбнага поезда (партызаны нападалі на найбольш важныя эшалоны). Як толькі з-за ўзгорка з'явіўся эшалон, гармата ўдарыла па поезду, і ён паляцеў пад адкос. Па вагонах быў адкрыт ружэйна-кулямётны агонь. Гітлераўцы не змаглі што-небудзь прадпрыняць. Састаў гарэў.

Крыху пазней сіламі чатырох атрадаў быў праведзен поўны разгром эшалона з жывой сілай. Адбылося гэта так. З засады партызаны абстралялі паравоз у момант, калі поезд ішоў поўным ходам. У выніку эшалон спыніўся. Пар-

тызаны скрыжаваным агнём абстралялі ўсе вагоны і падавілі супраціўленне ехаўшых на фронт узброеных немцаў. Пры гэтай аперацыі знішчана 500 салдат і афіцэраў і вялікая колькасць паранена. Партызаны-ж мелі са свайго боку 5 забітымі і 8 параненымі.

Поўны разгром нямецкіх эшалонаў, як тактыка, амаль-што ўпершыню быў шырока прыменены лепельскімі партызанамі. Гэты метад барацьбы наводзіў жывёльны страх на акупантаў і прымушаў іх узмацніць ахову чыгункі. Немцы насадзілі свае гарнізоны амаль на кожным кілометры, высеклі лес на абочынах дарогі, пільна правяралі чыгунку перад выхадам цягнікоў. Але і гэта іх не ратавала. Партызаны, узмоцненыя ў выніку гэтых баёў, набыўшыя вопыт барацьбы, працягвалі граміць камунікацыі, зрывалі дастаўку варожай тэхнікі і жывой сілы на фронт.

* * *

Ішоў 1943 год. Рос і развіваўся ўсё шырэй і шырэй партызанскі рух. З аднае брыгады неўзабаве стала дзве. Дуброўскі і Лабанок сталі камбрыгамі і дзейнічалі ўжо самастойна.

Владзімір Лабанок павёў сваіх змагароў у рэйд па тылах. Гэта быў марш з бесперапын-

ным боем, паход супроць нямецкіх акупантаў. Раптоўна і нечакана налятаў Лабанок са сваімі атрадамі на варожыя логавы і граміў, знішчаў іх да канца. Аднойчы нямецкі гарнізон заўважыў сілы Лабанка, якія набліжаліся да станцыі Чашнікі, і паспеў арганізаваць абарону. Народныя мсціўцы завязалі бой у адным напрамку групай сваіх сіл, астатнія групы накіраваліся ў абход ворага. Немцы не заўважылі як партызаны іх акружылі. Пачаўся штурм станцыі з усіх бакоў. Гітлераўцы, як ачумелыя, кідаліся наўцёкі. Дзесяткі іх трупаў валяліся на зямлі. 15 гітлераўцаў здаліся ў палон. На станцыі не засталося нічога жывога. Тут быў спалены склад з харчаваннем. 70 тысяч пудоў сена, 240 тон зерня,—усё гэта было знішчана, каб не маглі пажывіцца немцы.

Так грамілі, руйнавалі партызаны варожыя тылы. Ля нямецкага гарнізона Камень сам Лабанок арганізаваў засаду і на маршы разбіў калону нямецкіх аўтамашын. У гэтай жорсткай і храбрай схватцы знішчана 6 машын, 25 салдат і многа боепрыпасаў. 17 гітлераўцаў былі захоплены ў палон.

Амаль да Літвы дайшлі баявыя групы партызан Лабанка. На адваротным шляху яны знішчылі два гарнізоны, поўнасцю разграмілі ля станцыі Белокі воінскі эшалон праціўніка. Пе-

рабілі некалькі сот гітлераўцаў з засад і зноў вярнуліся на сваю базу.

У летнія месяцы 1943 года лепельскія партызаны паказалі цуды стойкасці і храбрасці. Каля двух месяцаў ішлі жорсткія баі з буйнымі сіламі нямецкіх карных экспедыцый. На баку праціўніка было 45 тысяч салдат, узброеных танкамі, артылерыяй, авіяцыяй. Гэта былі баі незвычайнай сілы, гісторыя іх назаве: вялікія бітвы ў тыле армій праціўніка.

Партызаны на чале з Лабанком дзейнічалі разумна. Яны білі нямецкія палкі па адным, раз'еднана. Так, напрыклад, характэрны бой з двума палкамі на масце. Партызаны зараней замініравалі мост і паблізу яго размясцілі свае агнявыя кропкі. Засада і мініраванне былі праведзены так майстэрскі, што немцы і падумаць нічога не маглі пра небяспеку. Два палкі рухаліся па дарозе на поўным маршы. Бой ім прадстаяў з партызанамі далёка, праз некалькі кілометраў. А выйшла... Як толькі на мост узыйшла найбольш густая калона фрыцаў, адбыўся аглушальны выбух і парваныя, аглушаныя, параненыя фрыцы паляцелі ў раку разам з кавалкамі маста. Астатніх партызаны ўзялі пад скрыжаваны агонь. Страты гітлераўцаў былі вялікія.

45 дзён партызаны стрымлівалі націск ворага, не ўступаючы яму сваёй асноўнай стаянкі. І толькі нанёсшы ім вялікія страты, перамалоўшы многа жывой сілы і тэхнікі, калі асноўная задача была выканана, партызаны зняліся і перайшлі ў другое месца. Немцы былі збянтэжаны, калі ўбачылі, што ў партызан не такія ўжо моцныя абарончыя лініі, як ім здавалася.

Немцы не зламілі дух народных мсціўцаў, як не зламіць ім вялікую волю ўсяго нашага народа да праведнай барацьбы за перамогу. Баі з нямецкай экспедыцыяй уяўлялі сабой масавы гераізм байцоў і камандзіраў. Незабыўна імя партызанкі з брыгады Лабанка Надзі Касцючэнка. У момант варожай атакі страляла яна да апошняга патрона, не пакідала кулямёта, біла немцаў. 20 гітлераўцаў прыкавала яна назаўсёды да зямлі. У крытычны момант яна ўзарвала сябе. Толькі яе прадсмяротныя словы данесліся да партызан: «Гіну за Радзіму». Бацька і сын Бураковы таксама знаходзіліся ля кулямёта да апошняй мінуты, і дорага каштавала немцам іх жыццё. Камандзір групы партызан Карабіцкі ў адной са схватак, будучы паранены, не вышаў з бою і працягваў біць немцаў да апошняга дыхання.

Вось гэтая сіла партызан Лабанка і з'яўляецца самым найбольш магутным умацаваннем.

якога не могуць узяць немцы ні танкамі, ні гарматамі, ні самалётамі. Перад гэтай сілай яны, наглыя нямецкія захопнікі, бездапаможны.

У канцы лета немцы пачалі яшчэ адну карную экспедыцыю, але яна праваліласся, лопнула, як мыльная бурбалка, не дала таго, чаго так хацелася немцам, — абясшкодзіць сябе ад партызан.

А брыгада Лабанка летам 1943 года прайшла новы слаўны этап выпрабавання і яшчэ больш зарэкамендавала сябе стойкасцю і адвагай, храбрасцю і гераізмам. Як баявая партызанская адзінка, брыгада зноў была гатова да чарговых баёў з акупантамі.

## У.

Усю арганізацыйна-партыйную работу Владзімір Елісеевіч Лабанок праводзіў пад знакам згуртавання мас на барацьбу з немцамі-акупантамі. Створаная ім сетка падпольных партыйных арганізацый ужо ў 1941 годзе паказала выдатныя ўзоры работы. Адна з пярвічных арганізацый забяспечыла друкаванне і распаўсюджанне ў самым Лепелі лістовак «Весткі з Совецкай Радзімы». Губінская падпольная арганізацыя першая забяспечыла правядзенне дыверсій супроць немцаў, а Каравічоўская — правяла вялікую работу па збору зброі для партызанскіх атрадаў.

Сіла ўсёй партыйнай работы, праваджэнай Лабанком, у тым, што яна была неадрыўнай ад працоўных мас. Людзі чутка прыслухоўваліся да голасу партыі, бо гэта быў іх уласны голас — голас непахіснай упэўненасці ў справядлівасць барацьбы, у непазбежную пагібель ворага, у абавязковую нашу перамогу.

Падпольная партыйная арганізацыя Лепельшчыны расла разам з партызанскімі атрадамі. За час баявых дзеянняў прынята пяць таварышоў у члены і 33 у кандыдаты партыі. Усе камуністы працавалі па спецыяльных заданнях райкома партыі. Лабанок меў моцную апору ў сваёй рабоце на камсамольскую арганізацыю, якая налічвала 258 членаў. Камуністы і камсамольцы выхоўвалі беспартыйных таварышоў найбольш дзейсным сродкам — асабістым прыкладам.

У памяці партызан брыгады Лабанка назаўсёды застануцца імёны бясстрашнага камуніста Марунька, які з 30 партызанамі стрымліваў націск 400 гітлераўцаў, камуніста Жукава, які з групай у 25 партызан вёў бой за адзін рубеж да апошняга дыхання, камсамольца Нікіфарава, які падбіў дзве нямецкія машыны і адзін вёў гарачы бой з групай немцаў, камсамольца Лапаткіна, які ў адным з баёў ва ўпор расстраляў з кулямёта 40 немцаў. Такіх людзей выхавала

падпольная партыйная арганізацыя. З такімі людзьмі можна ісці на любы подвіг.

Найвялікшую работу правяла партарганізацыя па наладжванню агітацыйна-масавай работы. Большэвіцкае слова, як жывіца, падтрымлівала народ, натхняла і вяла, бадзёрыла і клікала. Райком выдаваў раённую газету «Калгасная праўда». Па важнейшых падзеях выпускаліся лістоўкі, плакаты, асобна друкаваліся зводкі Совінформбюро. Усё гэта распаўсюджвалася розным спосабам: вывешвалася на дзверах і патаемна перадавалася з рук у рукі і зачытвалася насельніцтвам да дзірак. 13 тысяч экз. толькі адных лістовак распаўсюдзіла партарганізацыя.

Асаблівая ўвага была звернута на вусную прапаганду. У горад і сёлы ішлі пасланцы-прапагандысты падпольнага райкома і чыталі лекцыі, даклады, праводзілі гутаркі як калектыўныя, так і індывідуальныя. Кожная вестка з хуткасцю маланкі перадавалася з вуснаў у вусны, бадзёрыла, кранала душы людзей.

Як ад цёплага вясенняга дажджу ажываюць палеткі, так людзі пры кожнай новай партыйнай інфармацыі заўсёды весялелі, з'яўлялася надзея ў іх вачах, твар свяціўся радаснымі праменнямі. Таму і жыццё кожнага было звязана з партызанскай барацьбой і думы кожнага былі думамі аб совецкай Радзіме. Сяляне паўсямесна падтрым-

лівалі партызан ва ўсім. Нямецкіх законаў яны не слухаліся, мерапрыемствы іх улад зрывалі. Адчувалася, што ў раёне дзейнічае сіла ўсеабдымная, такая сіла, што ад зямлі ідзе магутнымі карэннямі і нікому чужому нічога не ўступіць свайго спрадвечнага, роднага, мілага.

Падпольная партыйная арганізацыя, была адчувальнай у кожным партызанскім удары па немцах, ва ўсім жыцці працоўных, якія сваімі штодзённымі справамі даказвалі веру ў совецкі лад і лютую нянавісць да нямецкіх вылюдкаў.

Міналі месяцы напружанай барацьбы. Совецкае інформбюро на ўвесь свет апавяшчала аб гераічнай барацьбе слаўных беларускіх партызан.

У яго паведамленнях вельмі часта было пра геройскія справы народных мсціўцаў Лепельскай брыгады, якой камандаваў Владзімір Елісеевіч Лабанок.

І сапраўды. К канцу 1943 года брыгада Лабанка мела добры вынік барацьбы—вялікі рахунак помсты нямецка-фашысцкім нягоднікам. Партызанамі было знішчана больш 3.000 нямецкіх салдат і афіцэраў, пушчана пад адкос 110 эшалонаў, у тым ліку 2 бронецягнікі, узарвана больш 100 чыгуначных і шасейных мастоў, разбіта і спалена 120 аўтамашын з боепрыпасамі і жывой сілай, 12 танкаў, падбіта 3 самалёты,

Гэты рахунак помсты можна было-б яшчэ намнога прадоўжыць, бо дзейнасць народных мсціўцаў шматгранная і вялікая ў поўным сэнсе гэтага слова.

Сам Владзімір Елісеевіч Лабанок быў не толькі душой гэтай вялікай барацьбы. Ён быў яе баявым удзельнікам — воінам, байцом. Ён меў свой асабісты баявы рахунак—салдацкую славу —17 знішчаных нямецкіх салдат і афіцэраў, 3 узарваныя воінскія эшалоны, 5 узляцеўшых у паветра аўтамашын, 5 разбітых умацаваных кропак і 11 узарваных і спаленых мастоў. Маюць рацыю тыя таварышы, што кажуць пра Владзіміра Лабанка:

— Такі сакратар райкома і партызанскі камандзір праз агонь правядзе за сабою людзей. З ім пойдзеш на працу і на подвіг.

У верасні 1943 года да партызан і насельніцтва Лепельшчыны дайшла прыемная вестка. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР за ўзорнае выкананне баявых заданняў камандвання ў барацьбе супроць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у тыле праціўніка і праяўленыя пры гэтым адвагу і геройства і асобыя заслугі ў развіцці партызанскага руху ў адной з абласцей Беларусі Владзіміру Елісеевічу Лабанку прысвоена званне Героя Совецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медалі «Залатая Звязда».

* * *

Вось і Масква. Надзея і гордасць кожнага савецкага чалавека. Сэрца і мозг вялікай сацыялістычнай дзяржавы. Уладзімір Лабанок прыбыў сюды з варожага тыла, каб зрабіць даклад аб баявых справах і атрымаць высокія ўзнагароды, якімі Урад Савецкага Саюза ўдастоіў мужнага партызана. У Крэмлі, з рук Міхаіла Іванавіча Калініна, Лабанок атрымаў ордэн Леніна, грамату аб прысваенні яму звання Героя Савецкага Саюза, ордэн Чырвонага Сцягу. Незвычайную радасць і хваляванне перажыў ён за гэтыя мінуты. Сэрца патрыёта напоўнілася велізарнай удзячнасцю партыі, савецкай уладзе, вялікаму Сталіну за такую высокую ацэнку яго работы ў варожым тылу.

Уладзімір Лабанок прагнуў хутчэй вярнуцца да сваіх арлоў-партызан, каб новымі баявымі справамі выказаць сваю ўдзячнасць за ўзнагароду і мацней крышыць нямецкія галовы, памнажаць славу народных мсціўцаў—бясстрашных барацьбітоў з нямецкімі акупантамі.

... Ішла вясна 1944 года. На зусім невялікім участку стварылася абстаноўка так званага «франтавога зацішша». Чырвоная Армія рыхтавалася да новае бітвы супроць нямецка-фашысцкіх ордаў. Немцы таксама сцягвалі свае сілы да лініі фронта. Адначасова яны прынялі ра-

шэнне павесці «рашаючую», як яны афішыравалі, барацьбу супроць партызан. А былі гэта партызаны Лабанка і суседнія з ім злучэнні народных мсціўцаў. Іх, дзейнасць так моцна трывожыла гітлераўскае камандаванне, што яно вымушана было паставіць на ногі свае рэгулярныя дывізіі і кінуць іх у экспедыцыю супроць партызан, каб абясшкодзіць дзейнасць у даным раёне партызанскіх злучэнняў.

Уладзімір Лабанок неўзабаве вярнуўся ў свае атрады. Тут сустрэлі яго баявыя таварышы з лікаваннем. Сустрэлі яго і паведамленнем—дакладнымі данымі аб падрыхтоўцы немцамі вялікай так званай карнай экспедыцыі. Палкоўнік Лабанок адразу-ж прывёў усё ў баявую гатоўнасць. Яшчэ і яшчэ раз усё было праверана і ўзважана. Партызанская зона ашчацінілася ўмацаванымі раёнамі. На радзе ўчасткаў пастаўлены ўзмоцнены заслон аховы, праведзена мініраванне дарог, прадугледжаны магчымыя шляхі пераходаў на новыя баявыя пазіцыі, наладжаны лавушкі для танкаў і пяхоты ворага.

Гутарка ішла аб сур'ёзных падзеях для партызанскага краю. Устаяць, вытрымаць, здужаць немца — было задачай не толькі дня, але і задачай вельмі важнага і адказнага этапа барацьбы. Немцы хацелі ачысціць свой бліжні тыл ад партызан. А партызаны наадварот пры-

кладалі ўсе намаганні для таго, каб наносіць больш адчувальныя страты ворагу і гэтым дапамагчы Чырвонай Арміі ў яе наступленні. Значэнне прадстаячай жорсткай бітвы, як аб гэтым сведчаць дакументы, высока ацэньваў і праціўнік. У загадзе асобага паліцэйскага батальёна СС ад 15 красавіка 1944 года гаварылася: «Вялікая плошча ва Ушачах з'яўляецца выключна партызанскім раёнам. Партызаны складаюць вялікую колькасць застаўшыхся злучэнняў Чырвонай Арміі і дэсантнікаў. Грамадзянскае насельніцтва гэтага раёна падтрымлівае іх. Усё замініравана. Ёсць магутныя ўмацаванні і трэба разлічваць на моцнае супраціўленне. Пры наступленні на гэты раён трэба разлічваць на тое, што партызаны атрымаюць дапамогу з боку авіяцыі Чырвонай Арміі. Асабліва значныя ўмацаванні яны маюць на ўчастку фронта, дзе павінны наступаць нашы батальёны. Гэта ўстаноўлена фотаздымкамі».

Так гаварыў вораг мовай дакументаў, у якіх ёсць доля праўды. Немцы нават фотаздымкі арганізавалі, каб больш ведаць пра сілы і размяшчэнне партызан. Хоць гэтыя фотаздымкі дапамагалі ім, што кашаль хваробе, аднак аб страху немцаў перад чакаемым супраціўленнем з боку партызан яны гавораць вельмі красамоўна. Зразумела і тое, што прадстаяла асаб-

ліва жорсткая крывепралітная барацьба для партызан. Лабанок і яго штаб працавалі круглыя суткі. Усё вывучалася і ўсё па некалькі разоў правяралася. Партызаны не спынялі сваёй дыверсійнай работы і прадаўжалі наносіць удары па камунікацыях і тылавых базах, складах, гарнізонах, штабах немцаў.

8 красавіка гітлераўскія орды, сілаю ў 58 тысяч салдат пяхоты, з 137 танкамі, 235 гарматамі, пры падтрымцы авіяцыі павялі наступленне на партызанскую зону. Разгарэлася адна з самых вялікіх бітваў мужных народных мсціўцаў з рэгулярнымі і паліцэйскімі часцямі ворага. Партызаны дзейнічалі сваёй улюбёнай тактыкай. То падпускалі яны адну за другой варожыя шарэнгі на блізкую адлегласць і касілі чужынцаў з усіх відаў зброі, то пускалі ў так званы «карыдор», а затым з усіх бакоў навальваліся і знішчалі гітлераўцаў да аднаго. Адначасова партызаны па-майстэрску манеўруючы, нечакана нападалі на варожыя падраздзяленні з тылу і, не даўшы немчуры апамятацца, білі яе няшчадна, разбівалі ў шляху падыходзячыя падмацаванні ворага.

Вопыт, набыты партызанамі за час Вялікай Айчыннай вайны, у момант гэтага сражэння быў вельмі адчувальным. Нямецкае камандаванне, не гледзячы на яўную перавагу сіл, не змагло хут-

ка, як яно планіравала з пачатку аперацыі, ачысціць раён ад партызан. Слязліва енчыў брудны нямецкі лісток «Новы шлях» (Віцебскае выданне) аб цяжкасцях барацьбы з партызанамі. У перыяд баёў гэты лісток пісаў:

«Многія вёскі партызаныператварылі ў своеасаблівыя крэпасці з поўнай кругавой абаронай. Многія з гэтых апорных пунктаў бяруцца толькі штурмам. Пяхота і сапёры ва ўзаемадзеянні з мінамётамі і артылерыяй, адарваўшыся далёка ад сваіх баз, вядуць цяжкую барацьбу... Цяжкасць аперацыі ўсугубляецца цяжкімі ўмовамі месца, адсутнасцю дарог і немагчымасцю планамернага баявога і харчовага снабжэння дзеючых войск».

Барацьба партызан пад кіраўніцтвам Владзіміра Лабанка была мужнай і па-ваеннаму зрэлай. Не гледзячы ні на танкі, ні на артылерыю, ні на перавагу ў жывой сіле, нямецка-фашысцкім мярзотнікам не ўдалося зламаць волю партызан да барацьбы і перамогі. Гітлераўскае камандаванне пасля паўтарамесячных баёў панесла такія страты, што вымушана было адказацца ад думкі «ачысціць раён ад партызанскіх сіл» і ўбралася, як кажуць, васваясі, пакінуўшы ў раёне баёў тысячы сваіх трупаў і велізарную колькасць тэхнікі.

Устаялі тыя, хто мужна змагаўся за чэсць, свабоду, незалежнасць сваёй Радзімы.

Устаялі тыя, хто бясстрашна, як львы, біліся з ворагам, усведамлялі кожны крок свой, кожны ўчынак.

Устаялі тыя, хто сваімі грудзьмі закрывалі варожыя кулямёты, даючы шлях у наступленне астатнім.

Устаялі тыя, хто кідаўся ў паядынак з танкамі немцаў і перамагаў іх;

— гэта ўстаялі нашы слаўныя партызаны.

Няма слоў, партызанскія сілы Лабанка ў гэтай аперацыі панеслі значныя страты. Але яны ні ў якім разе не ідуць у параўнанне з тымі велізарнымі стратамі, якія былі ў выніку баёў у праціўніка.

Атрымліваючы заслужаную ваенную ўзнагароду—ордэн Суворава 1-й ступені, у Мінску ў верасні 1944 года, Владзімір Елісеевіч Лабанок заявіў:

— Немцы хацелі паставіць беларускі народ на калені, зрабіць яго нявольнікам. Не выйшла! Тысячы лепшых сыноў беларускага народа са зброяй у руках выступілі па закліку вялікага Сталіна на абарону сваёй свабоды і жыцця. Немцы кідалі супроць партызан нашага злучэння цэлыя дывізіі, танкавыя палкі, эскадрыллі самалётаў. Але мы не скарыліся, не сталі

на калені перад праклятым ворагам. Толькі за 26 дзён гарачых і жорсткіх баёў у вясну гэтага года партызаны Ушацкой зоны знішчылі 8.298 фрыцаў і 12.870 паранілі. Нашы слаўныя партызанскія бронебойшчыкі і падрыўнікі падбілі ў гэтых баях 59 варожых танкаў, знішчылі 116 аўтамашын, збілі два самалёты...

Гэта словы сказаны перад усім народам, на ўвесь свет. Такія як Лабанок у вайне з нямецкімі акупантамі ў імя жыцця сваёй Радзімы ішлі на подвігі, якіх не бачыў свет, ішлі з чыстай верай у справядлівасць сваёй справы і змагаліся так, як ім падказвала сэрца, білі, знішчалі немцаў як шалёных звяроў, разілі іх насмерць і няшчадна гналі з нашай зямлі.

Наша родная Беларусь вызвалена ад фашысцкіх акупантаў. Камандзір партызанскай брыгады Владзімір Лабанок аддае свае сілы і здольнасці стваральнай рабоце на карысць народа. Мужны воін цяпер стаў удзельнікам вялікай справы аднаўлення народнай гаспадаркі Беларусі.

*г. Мінск, 19.9.44 г.*

---

Рэдактар Д. Т. Лебедзеў.

АТ29130 Падпісана да друку 4/III—45 г.
Тыраж 5 тыс. экз. Зак. № 2498.

Друкарня імені Сталіна, вул. Пушкіна, 55, Мінск.

ЦАНА 1 Р. 50 К.